Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
"Беларускі дзяржаўны
эканамічны ўніверсітэт"
_______________ У.М. Шымаў
"06" 07 2016 г.
Рэгістрацыйны № УД 2692-16 /вуч.

# КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 02 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый (па накірунках)»

2016

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Навасельцава І.І., дацэнт кафедры беларускай і рускай моў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**:
Старавойтава Н.П., дацэнт кафедры беларускай і рускай моў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт", кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Уласевіч В.І., вядучы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснай беларускай мовы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ**:

Кафедрай беларускай і рускай моў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт"
(пратакол № 13 ад 25.05 2016 г.);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт"
(пратакол № 5 ад 22.06. 2016 г.).

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне “Культура і мастацтва Рэспублікі Беларусь (факультатыў)” распрацавана для студэнтаў IV курса факультэта міжнародных бізнес-камунікацый спецыяльнасці “Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый” у адпаведнасці з адукацыйным стандартам спецыяльнасці і згодна найноўшых тэндэнцый у галіне сучаснай еўрапейскай адукацыі.

**Мэта:**

– фарміраванне і развіццё ў будучых спецыялістаў па міжкультурных камунікацыях беларускай этнакультуралагічнай кампетэнцыі ў звязку з каштоўнасцямі сусветнай культурніцкай прасторы.

**Задачы:**

<u>Культуралагічныя:</u>

– даць студэнтам комплексную сістэму тэарэтычных ведаў па асноўных раздзелах беларускай культуры: гісторыя культуры беларусаў, міфалогія, фальклор, этнаграфія, мастацкая культура;

– сістэматызацыя і паглыбленне ведаў пра культуру беларусаў як унікальную скарбніцу светапогляду і досведу народа, складнік яго ідэнтычнасці і неад’емную частку ў сістэме сусветных культур і агульначалавечых каштоўнасцяў;

– выпрацоўка ўмення выяўляць у сімволіцы традыцыйнай культуры беларусаў нацыянальна адмысловае і адносна ўніверсальнае ў кантэксце еўрапейскіх культур;

– развіццё ўменняў і навыкаў культуралагічных падагульненняў з мэтай арыентацыі ў свеце культурных і мастацкіх з’яў і параўнання эстэтычных і гістарычных характарыстык;

– укараненне пачуцця нацыянальнай самапавагі, выхаванне паважлівага стаўлення да матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларусаў, пачуцця адказнасці за яе захаванне.

<u>Камунікатыўныя:</u>

– развіццё і ўдасканаленне асобасных камунікатыўных якасцяў і эстэтычнага густу студэнтаў, каштоўнаснага ўспрымання роднай культуры ў кантэксце сусветных культур;

– дапамагчы зарыентавацца ў складанай сістэме паняццяў “культура і сусвет”, “культура і этнас”, “культура і асоба”, “культура і эканоміка”, усвядоміць ролю беларускай культуры ў духоўным развіцці нацыі, міжнародных стасункаў;

– развіццё навыкаў талерантных паводзін ва ўмовах культурніцкай разнастайнасці этнасаў;

– фарміраванне ўмення рэпрэзентаваць культурныя каштоўнасці Рэспублікі Беларусь пры міжкультурных кантактах.

**Склад кампетэнцый, якія фарміруюцца падчас навучання:**

*– акадэмічныя кампетэнцыі;*

*– сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі;*

*– прафесійныя кампетэнцыі.*

**Акадэмічныя кампетэнцыі**

– АК-1. Умець дасведчана арыентавацца ў сучасных беларускіх культуралагічных рэаліях, ведаць законы функцыянавання і асноўныя этапы развіцця культуры Беларусі.

– АК-2. Умець сістэматызаваць і абагульняць фактычны матэрыял, які адлюстроўвае асаблівасці культуры Беларусі.

– АК-3. Прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння практычных задач.

– АК-4. Валодаць даследчыцкімі навыкамі.

– АК-5 Валодаць навыкамі самастойнай працы.

– АК-6. Быць здольным да крэатыўнасцці, прапановы новых ідэй.

– АК-7. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

– АК-8. Умець ствараць электронныя прэзентацыі, праз выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій самастойна набываць і ўжываць на практыцы новыя веды і ўменні з мэтай павышэння кваліфікацыі цягам жыцця.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі**

– САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму, паважлівым стаўленнем да культурнай спадчыны беларускага народа і пачуццём адказнасці за яе захаванне.

– САК-2. Мець крытычнае мысленне.

– САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных і міжкультурных камунікацый.

– САК-4. Умець працаваць у камандзе.

**Прафесійныя кампетэнцыі**

– ПК-1. Умець эфектыўна карыстацца атрыманымі фонавымі ведамі ў прафесійнай дзейнасці.

– ПК-2. Спрыяць умацаванню іміджу нацыянальнай культуры праз папулярызацыю яе матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў у краіне і за мяжой, развіццё міжкультурных сувязяў.

– ПК-3. Мець навыкі рэпрэзентавання беларускай культуры падчас камунікацыі з прадстаўнікамі іншых соцыумаў (перамовы, сустрэчы, рэклама, турызм, арганізацыя выстаў, культурныя праекты).

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны

**ведаць:**

– ролю нацыянальнай культуры ў працэсе сацыялізацыі асобы;
– месца і ролю культуры беларусаў у еўрапейскім кантэксце і сістэме агульначалавечых каштоўнасцяў;
– генезіс, асноўныя раздзелы і этапы развіцця беларускай культуры як суладнай сістэмы духоўнага і практычнага досведу народа;
– структуральныя адзінкі беларускай культуралогіі і іх змест, сімволіку традыцыйнай культуры беларусаў;
– персаналіі беларускай культуры на розных яе ўзроўнях і ўплыў творцаў з Беларусі на сусветную культуру;
– шляхі і перспектывы інтэграцыі культуры Рэспублікі Беларусь у сусветны культурны працэс.

**Міжпрадметныя сувязі:**

У вучэбнай праграме прасочваюцца цесныя міждысцыплінарныя сувязі з гісторыяй, этналогіяй, сацыялогіяй, філасофіяй, псіхалогіяй, літаратурай, лінгвакраязнаўствам, лінгвакультуралогіяй, не дубліруючы іх.

Усяго гадзін па вучэбнай дысцыпліне 20, з іх усяго гадзін аўдыторных – 20, у тым ліку 14 гадзін – лекцыі, 6 гадзін – семінарскія заняткі.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1 Нацыянальная культура беларусаў у сістэме еўрапейскіх культур і сусветных каштоўнасцяў

Паняцце пра нацыянальную культуру, яе асноўныя складнікі і праблема іх інтэрферэнцыі. “Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры”. Дзяржаўная праграма “Культура Беларусі” на 2016 – 2020 гады (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 4 сакавіка 2016 года № 180).

Культура Беларусі: старажытнасць і сучасны стан. Роля і месца беларускага этнасу ў еўрапейскай цывілізацыі. Матэрыяльная і нематэрыяльная культура Рэспублікі Беларусь.

Культура Беларусі ў сістэме сусветных каштоўнасцяў. Інтэграцыя беларускай культуры ў сусветны культурны працэс. Усеагульная Дэкларацыя ЮНЕСКА аб культурнай разнастайнасці. Міжнародная канвенцыя ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Беларускія рэаліі ў Спісе культурных падзей ЮНЕСКА.

Умацаванне культурнага іміджу Рэспублікі Беларусь. Адкрыццё культурных цэнтраў Беларусі за мяжой; правядзенне дзён беларускай культуры. Беларуская дыяспара ў свеце як акумулятар грунтоўнага досведу захавання нацыянальнай і культурнай ідэнтычнасці. Культура беларускага замежжа. Рэалізацыя Дзяржаўнай Праграмы “Беларусы ў свеце”.

### Тэма 2 Беларуская міфалогія

Міфалогія як форма свядомасці і вобразнага мыслення народа, аснова ўсіх формаў культуры: мовы, рэлігіі, фальклору, літаратуры, мастацтва. Беларуская міфалогія: індаеўрапейскі кантэкст. Касмагонія. Міфалагічная мадэль свету ва ўяўленнях беларусаў. Міфалагема Прадрэва. Этнаастраномія. Міф як народная філасофія ў вобразах (касмаганічныя, гістарычныя і цыклічныя міфы).

Кангламерат паганскай і хрысціянскай культур. Язычніцтва як разгалінаваная рэлігія (анімізм, фетышызм, татэмізм і інш.) пэўных гістарычных эпох. Пантэон беларускіх багоў і народная дэманалогія. Культ Прыроды. Культ Маці-Зямлі і Багародзіцы. Архетыпы беларусаў як універсальныя культурныя сімвалы. Міфалогія і мастацтва. Сакральныя камяні, курганы, дрэвы, крыніцы, свяшчэнныя птушкі ў фальклоры, літаратуры, выяўленчым мастацтве. Міфалагічная расліна папараць-кветка. Магія беларусаў. Культ продкаў. Рэшткі татэмізму ў сучаснай культуры.

Рэканструкцыя міфалагічнай спадчыны. Элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны (светапогляд людзей, міфалогія) у Спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

### Тэма 3 Традыцыйная мастацкая культура беларусаў

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: нацыянальная адметнасць і месца ў еўрапейскім кантэксце. Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь”. Шляхі захавання рэгіянальных культурных традыцый (Падняпроўе, Панямонне, Усходняе Палессе, Заходняе Палессе, Паазер’е, Цэнтральны рэгіён) і іх трансляцыі нашчадкам.

Этнаграфічная спадчына Беларусі: традыцыйна-побытавая культура. Паняцці “народнае мастацтва”, “народныя мастацкія рамёствы”. Міфалагічны накірунак у

беларускай этнаграфіі. Мастацкія рамёствы беларусаў (кераміка і ганчарства; гутніцтва і кавальства; вырабы з металу, дрэва і костак; пляценне з саломы, лазы, бяросты; апрацоўка скуры, футра, воўны; прадзенне і ткацтва; вышыўка і выцінанка; лялькі). Традыцыйнае беларускае адзенне (народныя строі і шляхецкае адзенне). Дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва (слуцкія паясы і беларускія ручнікі). Беларускія музычныя інструменты. Музеі, выставы і фэсты традыцыйнага мастацтва беларусаў.

Традыцыйныя рамёствы беларусаў у Спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

**Тэма 4 Сімволіка беларускай народнай культуры**

Міфалагічны складнік у беларускай традыцыйнай культуры. Семантыка сімволікі рэчаў і аб'ектаў народнай культуры. Сям'я і сямейны побыт беларусаў. Сялянская сядзіба: інтэр'ер і прадметы побыту, сімволіка хаты і іншых гаспадарчых пабудоў.

Арнаментальная традыцыя беларусаў. Сімволіка і колер нацыянальных строяў. Прадметы-абярэгі: саламяны павук, лялькі, ручнікі, паясы і інш. Беларуская народная кухня: сімволіка страў у абрадах і святах.

Традыцыйная ежа беларусаў як элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны народа ў Спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Кулінарныя фэсты на Беларусі. Музеі этнаграфіі і побыту беларусаў.

**Тэма 5 Беларускі фальклор у кантэксце еўрапейскіх этнакультурных працэсаў**

Фальклор як мастацкая сістэма. Нацыянальная адметнасць беларускага фальклору, яго сувязь з вуснай народнай творчасцю іншых славянскіх народаў і месца ў сучаснай культурнай парадыгме. Міфалагічныя і прыродныя вытокі язычніцкіх традыцый у фальклоры. Семантыка беларускіх міфалагем у фальклоры. Міфалагізаваны герой у паданнях. Рэканструяванне пантэону славянскіх багоў праз фальклорныя і летапісныя тэксты.

Адам Міцкевіч як папулярызатар беларускага фальклору сярод славян. “Беларускі зборнік” Еўдакіма Раманава – адмысловая энцыклапедыя беларускага фальклору. “Беларусы” Яўхіма Карскага як першае манаграфічнае апісанне фальклорных жанраў. Энцыклапедыя “Беларускі фальклор” – першае ў гісторыі нацыянальнай культуры выданне па праблемах духоўнай культуры беларусаў.

Тыпы фальклорных традыцый (“архаіка”, “класіка”, “постфальклор”). Традыцыйная духоўная культура беларусаў: сямейная абраднасць (радзіны, хрэсьбіны, вяселле, пахаванне) і каляндарная абраднасць (зімне-вясенні і летне-асенні цыклы святаў). Хрысціянскія і свецкія напластаванні ў фальклоры. Беларускі нацыянальны характар і фальклор. Народныя гульні, забавы, ігрышчы. Рэспубліканскі фестываль народнага гумару “Аўцюкі”.

Фальклор і іншыя віды мастацтва. Беларускі аўтэнтычны фальклор у кантэксце еўрапейскіх этнакультурных працэсаў. Вусныя традыцыі і формы іх выражэння ў Спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь і Спісе сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

**Тэма 6 Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў:**
**традыцыі, навацыі, рэканструяванне**

Беларускі народны каляндар (гадавы цыкл святаў). Беларускія абрады як сведчанне самабытнасці і этнічнай унікальнасці нацыі. Сімвалы і вобразы беларускага абрадавага фальклору. Святочна-абрадавая культура беларусаў: каляндарна-абрадавы і сямейна-абрадавы фальклор. Рытуальна-магічная сфера беларускага фальклору. Вусная народная творчасць як найважнейшая частка духоўнай культуры народа. Вусна-паэтычны фальклор (паданні; выслоўі; казкі; загадкі; прыказкі і прымаўкі). Міфалагічныя персанажы чароўных казак (Баба-Яга, Цмок).

Народныя святы беларусаў: традыцыі і навацыі, рэканструяванне. Фальклорны фестывальны рух у Рэспубліцы Беларусь. Суіснаванне і ўзаемадзеянне культуры беларусаў і культур нацыянальных супольнасцяў Рэспублікі Беларусь.

**Тэма 7 Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай культуры**

Нацыянальная культура Беларусі як жыватворная крыніца літаратурнай спадчыны. Асветнікі зямлі беларускай. Беларуская літаратура: старажытнасць і сучаснасць (стылі, жанры і напрамкі; асноўныя матывы і вобразы).

Мова, фальклор і літаратура: іх узаемадачыненне. Паняцце сакральнага ў літаратуры. Этнічныя сімвалы ў нацыянальнай літаратуры. Вобразы нацыянальнай міфалогіі ў творах класікаў беларускай літаратуры. Міфалагізаваны герой у сучаснай літаратуры. Вобраз часу і дарогі ў беларускай літаратуры.

Дзень беларускага пісьменства. Літаратурныя праекты і конкурсы. Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры. Творы беларускай літаратуры ў перакладах на мовы свету. Юбілеі славутых беларускіх літаратараў у Спісе культурных падзей ЮНЕСКА.

**Тэма 8 Архітэктура і выяўленчае мастацтва Беларусі**

Дойлідства і архітэктура на Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Беларускае культавае, палацава-паркавае і грамадзянскае дойлідства XI – XX стагоддзяў: сімволіка і стылістыка. Архітэктурныя адметнасці рэгіёнаў Беларусі.

Турыстычныя маршруты. Матэрыяльная спадчына Беларусі ў Спісе сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА.

Выяўленчае мастацтва, графіка, фатаграфія і скульптура Беларусі (стылі, напрамкі, жанры). Суіснаванне розных стыляў і напрамкаў, пераемнасць традыцый. Мастацкія школы на тэрыторыі Беларусі. Іканапіс. Кніжная графіка.

Фотамастацтва. Творчасць беларускага і польскага майстра мастацкай фатаграфіі Яна Булгака.

Манументальная скульптура: мастацкія вобразы гістарычных асоб і дзеячаў культуры як увасабленне памяцці грамадства пра сваё мінулае.

Нацыянальна арыентаваная рэклама як від сучаснага мастацтва (Міжнародны фэст рэкламы і камунікацыі “Аднак!”).

Мастацкія музеі, галерэі і выставы ў Рэспублікіцы Беларусь. Беларускае мастацтва ў сусветным кантэксце.

**Тэма 9 Музычнае, тэатральнае і экраннае мастацтва Беларусі**

Музычнае мастацтва Беларусі: старажытнасць і сучаснасць, напрамкі і жанры. Музычныя фестывалі ў Беларусі. Беларускія музычныя сезоны ў Францыі. Выканальніцкае мастацтва. Захаванне і развіццё традыцый айчыннай кампазітарскай, музычна-выканальніцкай і балетнай школ у Рэспубліцы Беларусь.

Тэатр у Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Батлейка і яе нацыянальная самабытнасць. Беларускі прафесійны тэатр. Тэатральныя фестывалі і форумы ў Рэспубліцы Беларусь.

Кінамастацтва Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Анімацыя. Фестывалі кінамастацтва і анімацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Прапаганда музычнай, балетнай і тэатральнай культуры Рэспублікі Беларусь за мяжой.

### Тэма 10 Нацыянальныя традыцыі і сусветныя тэндэнцыі ў сучаснай літаратуры, мастацтве і музыцы

Беларуская літаратура, музыка і жывапіс у сістэме еўрапейскіх каштоўнасцяў (культурна-асветніцкія, літаратурныя і музычныя праекты, міжнародныя выставы). Нацыянальныя традыцыі і навацыі ў літаратуры, мастацтве і музыцы: узаемаўплыў і ўзаемаўзбагачэнне.

Фестывальны рух у Рэспубліцы Беларусь. Юбілеі славутых беларусаў у Спісе культурных падзей ЮНЕСКА.

Дзяржаўныя праграмы і праекты, скіраваныя на развіццё культурнага іміджу Рэспублікі Беларусь.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (факультатыў)» ДЛЯ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзін КСР | | | |
| | | | | | | Лек-цыі | ПЗ (СЗ) | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 1 | Нацыянальная культура беларусаў у сістэме еўрапейскіх культур і сусветных каштоўнасцяў | 2 | | | | | | [3] | |
| 2 | Беларуская міфалогія | 2 | | | | | | [1, 4] | Тэст |
| 3 | Традыцыйная мастацкая культура беларусаў | 2 | | | | | | [3, 5] | |
| 4 | Сімволіка беларускай народнай культуры | | 2 | | | | | [2, 3, 4] | Тэст, апытванне, прэзентацыі |
| 5 | Беларускі фальклор у кантэксце еўрапейскіх этнакультурных працэсаў | 2 | | | | | | [1, 3] | |
| 6 | Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: традыцыі, навацыі, рэканструяванне | | 2 | | | | | [1, 3, 4] | Тэст, рэфераты, прэзентацыі |
| 7 | Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай культуры | 2 | | | | | | [3] | |
| 8 | Архітэктура і выяўленчае мастацтва Беларусі | 2 | | | | | | [3, 5] | Тэст |
| 9 | Музычнае, тэатральнае і экраннае мастацтва Беларусі | 2 | | | | | | [3, 5] | |
| 10 | Нацыянальныя традыцыі і сусветныя тэндэнцыі ў сучаснай літаратуры, мастацтве і музыцы | | 2 | | | | | [3] | Тэст, рэфераты, прэзентацыі |
| | **Усяго гадзін** | **14** | **6** | | | | | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

***Метадычныя парады па арганізацыі самастойнай працы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Культура і мастацтва Рэспублікі Беларусь (факультатыў)»***

Важным этапам у авалоданні ведамі вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца самастойная праца студэнтаў. Рэкамендуецца бюджэт часу для самастойнай працы ў сярэднім 1–1,5 гадзіны на 2-х гадзінныя аўдыторныя заняткі.

Асноўнымі напрамкамі самастойнай працы студэнта з'яўляюцца:

– першапачатковае падрабязнае азнаямленне з вучэбнай праграмай вучэбнай дысцыпліны;

– азнаямленне са спісам рэкамендаванай літаратуры па вучэбнай дысцыпліне, знаходжанне яе ў бібліятэцы і іншых даступных крыніцах, вывучэнне неабходнай літаратуры па тэме, падбор дадатковай літаратуры;

– падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў па спецыяльна распрацаваных планах з вывучэннем асноўнай і дадатковай літаратуры, іншых крыніц;

– падрыхтоўка да выканання дыягнастычных формаў кантролю (тэсты, вусныя апытанні і г.д.).

***Нарматыўныя і заканадаўчыя акты***

1 Закон Рэспублікі Беларусь “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь” ад 04 чэрвеня 1991 года № 832-XI.

2 Закон Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны” ад 09 студзеня 2006 г. № 98-З.

3 Дзяржаўная праграма “Культура Беларусі” на 2016 – 2020 гады, зацверджаная пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 4 сакавіка 2016 года, № 180.

4 Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2004 г. № 627 “Аб зацвярджэнні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны”.

**ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (ФАКУЛЬТАТЫЎ)”**

1 Беларускае выяўленчае мастацтва: гісторыя і сучаснасць.
2 Беларускае сакральнае дойлідства.
3 Беларуская батлейка: гісторыя і рэканструяванне.
4 Беларуская дыяспара: гісторыя і сучаснасць.
5 Беларуская міфалогія і касмагонія.
6 Беларуская нацыянальная (народная) кухня.
7 Беларуская геральдыка.
8 Беларускі гумар. Фестываль беларускага гумару.
9 Беларускі фальклор – скарбніца этнічнай культуры Беларусі.
10 Беларускія абярэгі.
11 Беларускія архетыпы.
12 Беларускія народныя святы і абрады, звычаі і традыцыі, міфы і павер’і.
13 Беларускія народныя гульні і забавы: сучаснае рэканструяванне.
14 Ганчарная справа на Беларусі. Фэст “Арт- Жыжаль”.
15 Гісторыя беларускага кінематографа.
16 Гісторыя мастацтва фатаграфіі Беларусі.
17 Дзейнасць Інстытута культуры Беларусі: культурный імідж Рэспублікі Беларусь.
18 Унёсак славутых беларускіх літаратараў у развіццё беларускай мовы і літаратуры.
19 Дзяды: семантыка ўнікальнага беларускага памінальнага абраду.
20 Знакамітыя беларусы ў культурніцкай сусветнай прасторы.
21 Іканапіс на Беларусі.
22 Масленка і Сёмуха на Беларусі і ў Еўропе.
23 Мастацтва скульптуры.
24 Менталітэт і нацыянальны характар беларусаў.
25 Музычнае і балетнае мастацтва Рэспублікі Беларусь.
26 Народная дэманалогія (дамавік, лесавік, вадзянік, русалка і іншыя).
27 Нацыянальная тапаніміка: лінгвістычная этымалогія і легендарнасць.
28 Нацыянальны прафесійны тэатр (трупа Ігната Буйніцкага).
29 Нематэрыяльная спадчына Беларусі.
30 Пантэізм: культавыя крыніцы, камяні і дрэвы Беларусі.
31 Побытавая культура беларусаў: сялянская хата як мадэль сусвету.
32 Прыватныя тэатры Радзівілаў, Сапегаў, Агінскіх, Тышкевічаў.
33 Семантыка беларускіх Калядаў.
34 Семантыка Саракоў, Гукання вясны, Вялікадня на Беларусі.
35 Семантыка беларускага Купалля.
36 Сімволіка беларускага ручніка.
37 Сімволіка колеру ў ткацтве.
38 Сімволіка ўспрымання беларусамі свету і рэчаў.
39 Славутыя беларускія асветнікі.
40 Слуцкія паясы – нацыянальны скарб беларусаў.
41 Традыцыйныя беларускія рамёствы.
42 Тыпалогія беларускіх народных строяў.
43 Фестывальнае жыццё Рэспублікі Беларусь.
44 Этнаастраномія беларусаў.

## ЛІТАРАТУРА

### *Асноўная:*

1 Беларускі народны каляндар / укл. Лозка А. Ю. – Мінск : Полымя, 2002. – 237 с.
2 Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2003. – 350 с.
3 Культура Беларусі : у 6-і т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010 – 2015.
4 Міфалогія беларусаў / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.
5 Сахута, Я. М. Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2011. – 367 с.

### *Дадатковая:*

1 Беларускае замежжа / склад. Н.А. Голубева . – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2010.
2 Беларускі фальклор : у 2 т. / рэд. Пашкоў Г.П. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2006.
3 Беларусы. Т. 5. Сучасныя этнакультурныя працэсы / Каспяровіч Г.І. [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2009.
4 Бельскі А. І. Сучасная літаратура Беларусі. – Мінск : Аверсэв, 2000.
5. Габрусь, Т. В. Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына / Т. В. Габрусь. – Мінск : Беларуская навука, 2014.
6. Дадзіёмава, В. У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі да XX стагоддзя / В. У. Дадзіёмава. – Мінск : Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2012.
7 Дучыц, Л., Клімковіч, І. Сакральная геаграфія Беларусі. / Л. Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011.
8 Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва: У 2-х т. / Б. А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2007.
9 Ліцьвінка, В. Святы і абрады беларусаў / В. Ліцьвінка. – Мінск : Беларусь, 2001.
10 Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. – Мінск : Вышэйшая школа, 2001 – 2012.